**Выстава "Італьянскае срэбра XX стагоддзя", зладкаваная летась у мастацкай галерэі "Універсітэт культуры", выклікала сапраўдны фурор у артыстычным асяроддзі сталіцы. Энергія італьянскага калекцыянера Джорджыа Форні ды ініцыятыва Пасла Італіі ў Беларусі Нарберта Капэла паспрыялі ажыццяўленню ў Мінску яшчэ аднаго праекта: "Інтэр'ер і святло ў італьянскім дызайне". Гэтая выстаўка праходзіць да 27 снежня ў інтэр'ерным салоне кампаніі "Fusion House".**



# Сонца італьянскага дызайну

Творы, прадстаўленыя ўвазе мінскай публіцы, нельга нават і назваць мэбляй. Бо гэтыя прадметы здаюцца жывымі істотамі — настолькі вытанчаныя іх абрысы, гарманічныя прапорцыі і лініі, уласцівыя хутчэй жывой прыродзе. У разнастайнасці экспазіцыі даволі цяжка вылучыць самае цікавае, самае неардынарнае. І ўсё ж мяне найбольш прывабіла крэсла "Sushi", якое аб'ядноўвае ў сабе графічна-афіцыйны кантраст чорнага і светла-шэрага, амаль белага, і спалучэнне дзівосных звіваў драўляных ножак і падлакотнікаў ды ўтульнасць сядзення і спінкі, абшытых мяккай, але грубаватай па тэкстуры, тканінай.

Выстава ўяўляе сабой унікальны збор прадметаў інтэр'еру, створаных у розныя гады другой паловы XX стагоддзя легендарнымі дызайнерамі Італіі, такімі, як Луіджы Антані, Паола Партагезі, Карла Таламэо. Акрамя таго, экспануюцца шэдэўры лідэраў італьянскага індустрыяльнага дызайну фірмаў "Zanotta", "Kartell" ды інш.

У чым жа галоўная ідэя выставы "Інтэр'ер і святло ў італьянскім дызайне"? У тым, каб паказаць, што хаця аб'екты дызайну маюць прамысловы і камерцыйны характар, у аснове яны — менавіта творы высокага мастацтва, якія прысутнічаюць у многіх музеях свету.

Напярэдадні адкрыцця выстаўкі адбылася прэс-канферэнцыя ў фармаце "круглага стала" з удзелам сп. Нарберта Капэла, а таксама беларускіх спецыялістаў у галіне візуальнага, медыямастацтваў, архітэктуры ды інш. Абмяркоўваліся шматлікія актуальныя праблемы сучаснага стану італьянскага і беларускага дызайну.

На жаль, у Беларусі не так шмат сонечных дзён, як бы таго хацелася. "Інтэр'ер і святло ў італьянскім дызайне", падзея, якая завяршае цэлы шэраг культурных мерапрыемстваў, арганізаваных сёлета Пасольствам Італіі ў Беларусі, дапаможа мінчанам спрычыніцца да сонечнага святла, удыхнуць свежае паветра з апенінскіх прастораў, заключанае ў цудоўных творах італьянскага дызайну.

**Дзяніс БАРСУКОЎ,**
**дырэктар мастацкай галерэі "Універсітэт культуры"**





РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ